**Інструкцыя для трансферных і транзітных пасажыраў, якія прылятаюць з Расійскай Федэрацыі, Арменіі або Казахстана і накіроўваюцца далей у Расійскую Федэрацыю, Арменію або Казахстан**

1. Для пасажыраў, якія прыбываюць у Нацыянальны аэрапорт Мінск рэйсамі з аэрапортаў Расійскай Федэрацыі і вылятаюць у аэрапорты Расійскай Федэрацыі, пашпартны і мытны кантроль адсутнічае.

Трансферныя пасажыры, маючыя пасадачныя талоны на далейшы ўчастак палёту ў аэрапорты РФ, багаж якіх афармлены да канцавога пункта палёту, выходзяць з зоны прылёту рэйсаў з РФ (1-ы паверх сектар №5-6) і накіроўваюцца на 3-і паверх у залу афармлення пасажыраў на вылет. Па паказальніках пасажыры накіроўваюцца ў зону перадпалётнага надгляду пасажыраў рэйсаў у РФ (пункты надгляду E/F).

Калі багаж трансфернага пасажыра быў афармлены да Мінска, пасажыру трэба атрымаць свой багаж у зоне выдачы багажу, аформіць яго на стойцы рэгістрацыі (3-і паверх) да аэрапорта назначэння і прайсці афармленне на рэйс ва ўстаноўленым парадку.

2. Для пасажыраў, якія прыбываюць у Нацыянальны аэрапорт Мінск рэйсамі з аэрапортаў Арменіі і Казахстана і вылятаюць у аэрапорты Арменіі і Казахстана, мытны кантроль адсутнічае. Пашпартны кантроль пасажыры праходзяць на вылет і прылёт.

Пасля праходжання пашпартнага кантролю (сектар прылёту № 1-2) трансферныя пасажыры, багаж якіх афармлены да канцавога пункта палёту (ёсць пасадачны талон на наступны ўчастак палёту або да канцавога пункта палёту), выкарыстоўваючы ліфт або эскалатар, накіроўваюцца на 3-і паверх у залу афармлення пасажыраў на вылет. Па паказальніках пасажыры накіроўваюцца ў пункт надгляду E для праходжання пашпартнага кантролю і перадпалётнага надгляду.

Грамадзяне краін, якім патрэбна транзітная віза Рэспублікі Беларусь, з зоны прылёту па лесвічным пралёце або выкарыстоўваючы ліфт, падымаюцца на ўзровень 2-га паверха, дзе ў зоне абслугоўвання трансферных пасажыраў праходзяць: кантроль праязных дакументаў, перадпалётны надгляд і далей накіроўваюцца ў залу вылету на 3-і паверх для праходжання пашпартнага кантролю праз кабіны пашпартнага кантролю «ТРАНСФЕР: Арменія, Казахстан, Расія» і выхаду на пасадку № 10-11.